# ПЕРАЕМНАСЦЬ ТРАДЫЦЫЙ

Адным з першых крокаў па шляху перабудовы вышэйшай школы з'явіўся дэкрэт ад 2 жніўня 1918 года «Аб прыёме ў вышэйшыя навучальныя ўстановы РСФСР», падпісаны У. І. Леніным, па якому ліквідаваліся ўсе перашкоды для паступлення працоўнай моладзі ў вышэйшыя навучальныя ўстановы. Дэкрэт быў накіраван на змяненне сацыяльнага саставу студэнцтва і прыцягненне ў вну працоўнай моладзі.

Аднак каб выкарыстаць адкрытыя магчымасці, рабочым і сялянам трэба было атрымаць неабходную падрыхтоўку. Яе і прызваны былі даць рабочыя факультэты. 17 верасня 1920 г. У. І. Ленін падпісаў дэкрэт «Аб рабочых факультэтах», асноўнай задачай якіх было шырокае прыцягненне пралетарскіх і сялянскіх мас у сцены вышэйшай школы.

Улічваючы важнасць рабочых факультэтаў, іх вырашана было прыраўняць да асноўных факультэтаў, што зрабіла рабфакі арганічнай часткай вышэйшых навучальных устаноў.

Падрыхтоўка да адкрыцця рабочага факультэта ў Мінску вялася разам з актыўнай арганізацыйнай работай па стварэнню Беларускага дзяржаўнага універсітэта.

17 красавіка 1921 г. у Мінску адбылося пасяджэнне прадстаўнікоў ЦВК і Саўнаркома Беларусі, часовага праўлення універсітэта, на якім абмяркоўвалася пытанне аб адкрыцці рабочага факультэта. На наступны дзень Прэзідыум ЦВК БССР прыняў пастанову, у якой гаварылася аб адкрыцці універсітэта ў саставе наступных факультэтаў: рабочага, грамадскіх навук, медыцынскага, сельскагаспадарчага і фізіка-матэматычнага.

У маі 1921 г. быў аб'яўлен прыём на рабфак універсітэта і падрыхтоўчыя курсы пры ім. Газета «Звязда» ад 10 мая 1921 г. паведамляла чытачам аб умовах прыёму.

1 чэрвеня пачаліся заняткі на рабочым факультэце. Парог рабфака пераступілі 160 першых слухачоў, у іх ліку 69 рабочых, 72 селяніна і 19 чырвонаармейцаў. Пасля паўтарамесячнай вучобы і канікул было залічана яшчэ 125 чалавек. Партыйныя арганізацыі накіравалі на вучобу 43 чалавекі, камсамольскія — 11, прафсаюзныя — 138, савецкія органы — 72, перавялося з іншых рабфакаў — 19.

На рабфаку была створана моцная партыйна-камсамольская праслойка —62 камуністы і 25 камсамольцаў. Рабочыя занялі 176 месц, сяляне — 109. Узроставы састаў рабфакаўцаў— ад 20 да 30 год.

У вучэбны план уваходзілі: матэматыка, гістарычны матэрыялізм, палітычная эканомія, геаграфія, фізіка, прыродазнаўства, руская мова і літаратура, Канстытуцыя РСФСР, гісторыя культуры, замежная мова. Тэрмін вучобы — тры гады.

За час існавання рабфак Беларускага дзяржаўнага універсітэта падрыхтаваў у вну каля 2 тысяч чалавек.

Традыцыі рабфака БДУ 20-х гадоў развіваюцца ў нашы дні на падрыхтоўчым аддзяленні.

М. ЧУДАЕЎ.

# ЯК ЖЫВЕШ, РАБФАК?

Веснавое сонца зачапілася за аконную раму і заглядвае ў акно дэканата. За сталом схіліліся трое: Анатоль Іосіфавіч Кажушкоў — дэкан падрыхтоўчага аддзялення, Валодзя Карагін — сакратар партбюро і яго намеснік Яша Анапрыенка. Хлопцы расказваюць аб рашэннях апошняга партыйнага сходу, на якім Анатоль Іосіфавіч не змог прысутнічаць. Потым усе разам абмяркоўваюць план работы на наступны месяц. Здавалася б, зусім звычайныя абставіны, калі б не адна акалічнасць: шчырая сяброўская нарада-гутарка ідзе паміж дэканам і... студэнтамі.

На падрыхтоўчым аддзяленні існуе такое правіла: студэнты ўсе пытанні вырашаюць самастойна. А дэканат, выкладчыкі дапамагаюць ім, накіроўваюць іх. Інакш і не можа быць там, дзе амаль трэць слухачоў— камуністы.

## ВУЧОБА

Жадаючых трапіць на падрыхтоўчае аддзяленне ў гэтым годзе было як ніколі многа (48 чалавек на кожныя 10 месц). Адбор ішоў самы ўважлівы, і вось вынік — 53 выдатнікі пасля першай жа сесіі. Амаль усе, хто адчуваў сябе спачатку няўпэўнена, няцвёрда, зараз з усёй падставай могуць сказаць, што ведаюць не менш учарашніх школьнікаў, а па некаторых прадметах нават больш. Узяць, напрыклад, геаграфію. Чытае яе Зінаіда Якаўлеўна Андрыеўская. І не проста чытае, а імкнецца даць сваім вучням як мага больш ведаў, расказвае аб новых адкрыццях і даследаваннях. (На здымку ўнізе).

Асабліва цяжка было многім з рускай мовай. Школу скончылі некалькі год назад, а для самастойных заняткаў часу не хапала. Але прыйшоў на дапамогу добры, адданы сваёй справе чалавек — Франя Міхайлаўна Літвінка. Настойліва, не шкадуючы часу, прывівае яна сваім выхаванцам любоў да мовы, дае ім трывалыя веды.

Слухачам падрыхтоўчага можа пазайздросціць не адзін школьнік: акрамя ўтульных аўдыторый, кіназалы, чытальнай залы, слухачы розных спецыяльнасцей маюць магчымасць праводзіць практычныя заняткі ў лабараторыях і на кафедрах адпаведных факультэтаў універсітэта.

Вось толькі падручнікаў не хапае. Бібліятэка універсітэта не можа забяспечыць поўнасцю, а ў магазінах — няма. Усё ж знаходзяць нейкае выйсце самі. А каб гэта не паўтарылася і ў наступныя гады, вырашылі хлопцы і дзяўчаты ўсе асабістыя падручнікі пасля вучэбнага года падараваць падрыхтоўчаму аддзяленню.

Вучэбная нагрузка на факультэце вялікая: прыходзіцца амаль занава вывучаць усё тое, што забыта за гады работы на прадпрыемстве ці службы ў арміі. Не ўсім гэта пад сілу. Слабыя не вытрымалі, забралі дакументы адразу ж пасля першых тыдняў заняткаў. Некаторых прыйшлося выключыць за непаспяховасць. Зараз засталіся тыя, хто мае цвёрдае жаданне атрымаць універсітэцкі дыплом па выбранай спецыяльнасці.

На аддзяленні моцныя партыйная і камсамольская арганізацыі. Энтузіязм саміх слухачоў плюс поўнае давер'е выкладчыцкага саставу і дэканата робяць тое, што не зможа зрабіць ні адзін загад, ні адна інструкцыя. Нехта не паспявае—яму адразу ж выдзяляюць шэфа, засумняваўся—прымусяць паверыць у свае сілы.

Няма больш уважлівых слухачоў, чым слухачы падрыхтоўчага аддзялення. Трэба ўсё зразумець, запомніць, каб не было сорамна потым ні перад родным заводам, які накіраваў на вучобу, ні перад сваёй ваеннай часцю. Таму на лекцыях пануе заўсёды цішыня, таму не адпускаюць пасля званка выкладчыка, закідваючы яго рознымі пытаннямі.

— І наогул, добрая гэта справа — падрыхтоўчае аддзяленне, — гаворыць Валодзя Мядзелец, камсорг групы географаў, — яно многа дае нам. І не адны веды.

## БЫТ І АДПАЧЫНАК

Яны не толькі разам вучацца. Яны сталі адной сям'ёй. Здаецца, што можа аб'яднаць у такі кароткі тэрмін зусім розных, дарослых, з ужо сфарміраваўшыміся характарамі і поглядамі на жыццё людзей? А яны вось здружыліся. Не бяда, што ў інтэрнаце іх рассялілі па розных пакоях, —займацца можна ўсё роўна сумесна. Географы ходзяць разам у тэатр і ў музеі, рыхтуюць віктарыну. Неяк Наташа Казлова правяла гутарку аб Бетховене. Дачуліся пра гэта і ў іншых групах — запрасілі да сябе. І вось ужо ўсё аддзяленне «хварэе» класікай. Разам рыхтуюць літаратурны вечар, сустрэчу з выпускнікамі мінулых год і проста гуляюць па гораду.

Ёсць на аддзяленні свая газета «Рабфакавец-73». Рэдагуе яе будучы журналіст Валодзя Ефанаў. Вучыцца Валодзю накіравалі адразу ж пасля заканчэння службы ў арміі. Таму нават у афармленні газеты адчуваецца армейскі почырк. Пра што расказвае «Рабфакавец»? Пра тое, як жывуць, што хвалюе.

## РАДАСЦІ І ХВАЛЯВАННІ

Кожны панядзелак збіраецца разам партыйны і камсамольскі актыў. Расказваюць аб справах за тыдзень. Раяцца, мяркуюць, спрачаюцца. Жыллёва-бытавая камісія партбюро на чале з В. У. Каралём рыхтуе чарговую справаздачу аб справах у інтэрнаце. Зіна Дарашчонак, камсорг групы філолагаў, расказвае, што Тарасевіч і Шчарбіна, у якіх не ўсё ладзілася з вучобай, сталі займацца значна лепш. Абмяркоўваюць, як лепш выканаць пастанову камсамольскага сходу «Кожнай групе, кожнаму камсамольцу — ударную справу». Дарэчы, сход прайшоў вельмі бурна і цікава. Камітэт камсамола універсітэта прыслаў дакладчыкаў, а жадаючых выступаць у спрэчках было шмат. І гэты сход — не выключэнне. Так бывае заўсёды. Бо ёсць аб чым гаварыць, спрачацца, бо няма абыякавых...

Зараз усе рыхтуюцца да Ленінскага заліку «Рашэнні XXIV з'езда КПСС—у жыццё». Кожны камсамолец склаў асабісты комплексны план «Ідэям Леніна верныя», кожны абраў справу па душы: ці то правядзенне палітінфармацый, дапамога таварышу, удзел у выпуску насценнай газеты, ці то арганізацыя «агеньчыка» да Дня касманаўтыкі. Групы спаборнічаюць паміж сабой. Вынікі падводзяцца ў канцы семестра.

Вось ужо каторы раз вырашаюць, што рабіць з адстаючымі. Іх 15 чалавек. Яшчэ да першай сесіі было пастаўлена пытанне аб іх знаходжанні на аддзяленні. Доўга спрачаліся, раіліся. Нарэшце, узялі «на парукі», пашкадавалі, ці што. Дапамагалі ім, тлумачылі незразумелае. Некаторыя выправіліся, але не ўсе... І вось зноў павінен сабрацца камітэт камсамола і зноў вырашаць, што ж рабіць. Толькі ці дапаможа літасць тым, хто не проста лянуецца, а каму, скажам прама, цяжка вучыцца. Ці не робім мы «мядзведжую паслугу»? Аб гэтым задумваюцца слухачы.

І Валодзя Карагін, і сакратар камітэта камсамола Валера Жылінскі, і іншыя разумеюць, што не ўсё яшчэ добра: не навучыліся працаваць з кожным чалавекам асабіста, не заўсёды кантралююць свае рашэнні, адкрываючы тым самым шчылінку, у якую пралазіць фармалізм. Але на сваіх жа памылках вучацца.

## ЗАМЕСТ ЭПІЛОГА

Толькі што празвінеў званок, і гаманлівы калідор апусцеў. Ціха ў аўдыторыях. Так ціха, што нават сонейка, заглянуўшы туды праз акно і ўбачыўшы людзей, здзівілася. Стукае аб дошку крэйда ў руках сінявокай дзяўчыны: H₂O+...

Л. ПЕРАСЫПКІНА.






# ЗБРОЯЙ КРЫТЫКІ

Штаб «Камсамольскага пражэктара» гістфака будуе сваю работу ў строгай адпаведнасці з распрацаваным планам: не менш двух разоў у месяц праводзяцца рэйды ў інтэрнат, правяраецца наведванне заняткаў, падрыхтаванасць студэнтаў да практычных, семінарскіх і г. д. Уся наша дзейнасць накіравана не толькі на выяўленне недахопаў, але і на іх папярэджанне. Напрыклад, парушальнікаў дысцыпліны ў выпусках «КП» мы не проста крытыкуем, а стараемся паказаць прычыны дрэннага ўчынку з тым, каб было павучальна для ўсіх студэнтаў. Такім жа чынам мы асвятлялі падрыхтоўку камсамольцаў да зімовай сесіі, дапамагаем правільна размеркаваць свой час.

Акрамя газеты, штаб «КП» рэгулярна выпускае баявыя лісткі і «маланкі», дзе адлюстроўваюцца найбольш вострыя і злабадзённыя пытанні вучэбнага, грамадскага і спартыўнага жыцця факультэта.

На жаль, камсамольскія бюро курсаў слаба рэагуюць на вострыя сігналы, у асноўным яны актывізуюцца толькі тады, калі справа даходзіць да выключэння камсамольца з універсітэта. Як жа яны рэагуюць? А яны... абвінавачваюць сябе: маўляў, не дагледзелі.

Самымі лепшымі нашымі памочнікамі і кіраўнікамі ў рабоце з'яўляюцца партыйнае бюро і дэканат факультэта. Аднак поспехі ў многім залежаць і ад саміх «пражэктарыстаў», ад іх жадання і ўмення працаваць. Добра спраўляюцца са сваімі абавязкамі члены штаба В. Ціханаў, Н. Касцюковіч, А. Невяроўскі.

Для таго, каб быць заўсёды ў курсе ўсіх падзей, у камсамольскіх групах былі выбраны пасты «КП» і праведзена вучоба «пражэктарыстаў». Аднак не быў своечасова назначан адказны ў камсамольскім бюро за каардынацыю дзейнасці гэтых пастоў, таму работа іх зрывалася. У першым семестры амаль не працавалі члены пастоў «КП» на аддзяленні філасофіі. На аддзяленні палітэканоміі пасты былі створаны толькі да зімняй сесіі. Лепшыя справы на аддзяленні гісторыі. Добра тут працуюць «пражэктарысты» Т. Пётух, О. Яроміна, О. Барысевіч.

У планах работы на II семестр больш увагі мы ўдзялілі дзейнасці добраахвотнай народнай дружыны факультэта, падрыхтоўцы мастацкай самадзейнасці да агляду-конкурсу, пытанням вучобы і адпачынку студэнтаў. Праведзена сумеснае пасяджэнне штаба «КП» і акадэмсектара камітэта камсамола, на якое былі выкліканы студэнты-хвасцісты. Тут былі высветлены прычыны запазычанасці і вызначаны тэрміны яе ліквідавання.

М. ЗЫЛЬ,
старшыня штаба «КП» гістфака.

# ДНІ ДОНАРА

Донар — чалавек, які дорыць жыццё другому чалавеку. Донарская кроў — вялікі гаючы сродак, які часта нельга замяніць ніякімі лякарствамі. Ні адна цяжкая і працяглая аперацыя не абыходзіцца без пералівання крыві. Донарская кроў шырока прымяняецца пры хірургічных, многіх унутраных, інфекцыйных, дзіцячых і іншых захворваннях. Неабходна яна і ў радзільных дамах.

З донарскай крыві рыхтуюць каштоўныя прэпараты, шырока прымяняемыя ў практыцы лячэбных устаноў. Як лячэбны метад пераліванне крыві, а таксама прымяненне яе кампанентаў не маюць сабе роўных па шырыні прымянення і сіле ўздзеяння. У нашай краіне з многамільённым насельніцтвам неабходнасць у донарскай крыві надзвычай вялікая. Тыя, хто дае сваю кроў для выратавання людзей, дастойныя самай высокай павагі. Донарам можа быць кожны практычна здаровы чалавек ва ўзросце ад 18 да 60 год.

Перад дачай крыві донар атрымлівае лёгкае снеданне, а пасля — абед. Яму прадастаўляецца два дні адпачынку. Пры жаданні донар можа далучыць гэтыя дні да чарговага адпачынку, атрымліваючы пры гэтым свой сярэдні заработак. Студэнтам прадастаўляецца адпачынак на 5 сутак на аснове даведак з інстытута пералівання крыві і паліклінікі універсітэта. Кроў у донара дазваляецца браць з інтэрвалам не менш, чым у 8 тыдняў.

Для здаровых людзей донарства бясшкоднае. А клінікі, бальніцы горада Мінска адчуваюць вострую патрэбу ў донарскай крыві.

У нас ва універсітэце вучацца многія студэнты, якія далі бязвыплатна кроў шматразова, а такія, як Н. Штыронак, В. Кандрацюк, Т. Алейнік, А. Яфімаў, С. Яўсігнеева, В. Грыгор'еў, далі кроў па 6—7 разоў. Дзевяць студэнтаў далі кроў па 5 разоў, 22 студэнты — па 4 разы, 30 студэнтаў—па 3 разы. За актыўны ўдзел у бязвыплатным донарстве загадам рэктара аб'яўлена падзяка 70 студэнтам і супрацоўнікам універсітэта, а Кастрычніцкі раённы камітэт Таварыства Чырвонага Крыжа ўзнагародзіў 8 студэнтаў падарункамі.

Слаба, на жаль, удзельнічаюць у патрыятычным бязвыплатным донарстве рабочыя, служачыя і прафесарска-выкладчыцкі састаў, БДУ, за выключэннем кафедры педагогікі і псіхалогіі.

Адпаведна графіку горада, універсітэту ўстаноўлены на першае паўгоддзе 1973 г. два дні донара — 23 і 24 красавіка.

Забор крыві будзе праведзен у памяшканні паліклінікі універсітэта з 10 да 16 гадзін. Лячэбныя ўстановы горада Мінска спадзяюцца, што студэнты, рабочыя, служачыя і прафесарска-выкладчыцкі састаў універсітэта актыўна прымуць удзел у бязвыплатным донарстве і дадуць сваю кроў для лячэбных мэт.

**В. ЦІМАФЕЕЎ,**
**старшыня камітэта Таварыства Чырвонага Крыжа БДУ.**

# ФІЗКУЛЬТУРА І СПОРТ — НАШЫ СЯБРЫ



Ва ўсім свеце бурнымі тэмпамі развіваецца навука і тэхніка. Аб'ём навуковых ведаў у сярэднім падвойваецца кожныя 5—10 год. Адпаведна пастаянна расце колькасць людзей, занятых разумовай працай. Акадэмік Берг падлічыў, што калі ў сярэдзіне XIX стагоддзя з усёй энергіі, вырабляемай і спажываемай на зямлі, 94 працэнты прыходзілася на мышачную сілу чалавека і хатніх жывёл, то сёння сіла мускулаў выкарыстоўваецца толькі на адзін працэнт.

Студэнты і навуковыя супрацоўнікі значную частку свайго часу праводзяць у аўдыторыях, бібліятэках, лабараторыях. Разумовая праца, акрамя неабходнага для грамадства і, безумоўна, цікавага працэсу набыцця ведаў, і стамляе чалавека. Стамляецца мозг. Вялікая нагрузка падае на нервовую сістэму. Паніжаецца сіла і рухомасць коркавых працэсаў. Акрамя таго, малярухомая, сядзячая поза садзейнічае зніжэнню ўзроўню абмену рэчываў і акісляльна - аднаўленчых працэсаў, паяўляюцца застойныя з'явы ў вобласці брушных органаў і ніжніх канечнасцей.

Пры напружанай разумовай працы павышаецца ціск крыві ў скроневых артэрыях, павялічваецца тонус артэрый галавы. Як вынік гэтага, паяўляюцца адчуванне цяжкасці ў галаве і галаўныя болі. Адначасова пагаршаюцца такія псіхічныя працэсы, як уважлівасць, памяць, успрыняцце.

З мэтай захавання добрай разумовай працаздольнасці неабходна рабіць перапынкі для адпачынку ў залежнасці ад напружання работы. Найлепшым чынам энергія коркавых клетак аднаўляецца, калі ў час перапынку даваць сабе не пасіўны, а актыўны адпачынак — прагулка, невялікі комплекс фізічных практыкаванняў.

Чалавек здаўна надаваў фізічнай культуры вялікае значэнне. Стройная сістэма фізічных практыкаванняў у Грэцыі, Рыме, розныя спаборніцтвы, гульні многіх народаў — важнае пацвярджэнне гэтага. Лепшыя ўрачы Усходу, Індыі, Грэцыі надавалі вялікае значэнне фізічным практыкаванням у падтрыманні здароўя чалавека і вылечванні яго ад многіх захворванняў, у першую чаргу сардэчна-сасудзістых.

Шматлікія псіхафізічныя даследаванні паказваюць добры ўплыў фізічнай культуры і спорту на чалавека любога ўзросту. Паляпшаецца сардэчна-сасудзістая сістэма, умацоўваецца сардэчная мышца, нармалізуецца крывяны ціск, павышаецца эластычнасць крываносных сасудаў, памяншаецца перыферычнае супраціўленне крыві. Адсюль — лепшы настрой, больш паспяхова ідзе праца. Вось чаму фізічныя практыкаванні павінны стаць абавязковымі, жыццёва неабходнымі для чалавека разумовай працы. Студэнту і навуковаму супрацоўніку трэба планаваць пэўную частку дня на заняткі фізічнай культурай і спортам.

Захаванне і ўмацаванне здароўя кожнага грамадзяніна нашай краіны не толькі яго асабісты клопат, але і сацыяльна-эканамічная праблема ў маштабах усёй дзяржавы. Нездарма Камуністычная партыя і Савецкі ўрад многа ўвагі ўдзяляюць развіццю фізічнай культуры і спорту, лічачы фізічнае выхаванне неад'емнай часткай камуністычнага выхавання, а фізічную культуру—састаўной часткай сацыялістычнай культуры.

У далейшым мы спынімся на відах фізічных практыкаванняў, якія можна рэкамендаваць чалавеку разумовай працы для самастойных заняткаў.

**У. РЭЙЗІН,**
**ст. выкладчык кафедры фізвыхавання і спорту.**

# У АДНАЎЛЕННЕ ТРАДЫЦЫЙ

Чатыры дні ў канцы сакавіка ў новым корпусе Магілёўскага педагагічнага інстытута праходзіла першынство вну Беларусі па фехтаванню. Такія спаборніцтвы з'яўляюцца самымі вялікімі ў рэспубліцы і выклікаюць ажыўленую цікавасць.

У першынстве прынялі ўдзел 174 чалавекі з 15 вну, такія прызнаныя калектывы, як ІФК, РТІ, Гомельскага дзяржаўнага універсітэта і іншыя.

Барацьба ў асабістым першынстве разгарэлася з першай ступені. Трэнеры настройвалі спартсменаў змагацца за кожны ўкол, за кожную перамогу, бо толькі 12 першых месц давалі залік камандзе. З-за высокай спартыўна-тэхнічнай падрыхтоўкі студэнтаў канкурэнцыя была надзвычай моцнай. Так, у жаночай рапіры выступала 26 кандыдатаў і майстроў спорту, у шпазе — 17, рапіры — 16, шаблі — 15.

У асабістых спаборніцтвах у нашай камандзе лепш за ўсіх выступіў майстар спорту аспірант біяфака Аляксандр Нечапурэнка, які, прайграўшы адзін бой у фінале, заняў другое месца. У мужчынскай рапіры паспяхова выступаў студэнт І курса юрфака Сяргей Барадзін (6 месца), у жаночай — студэнтка І курса гістфака Таццяна Дронь (10 месца). Астатнія ўдзельнікі занялі больш скромныя месцы і заліковых ачкоў камандзе не далі.

Калі асабістыя спаборніцтвы для нашых спартсменаў прайшлі параўнальна паспяхова, то выступленні ў камандных былі проста сенсацыйнымі. Першымі парадавалі нашы саблісты Ю. Гафо, А. Швайко (фізфак) і М. Шубіч (журфак), якія, паспяхова прайшоўшы папярэднія спаборніцтвы, разграмілі з лікам 5:1 моцную каманду інстытута замежных моў, ва ўпартай барацьбе выйгралі ў каманды РТІ і занялі чацвёртае месца ў фінале. Другой нечаканасцю з'явілася другое месца ў рапірыстаў (С. Барадзін — юрфак, В. Парткоў — выпускнік хімфака, В. Барадачэнка — юрфак). Выступленне шпажыстаў А. Нечапурэнкі (аспірант біяфака), С. Мяснікова (лабарант кафедры фізвыхавання) і У. Лісоўскага (студэнт фізфака) і іх другое месца ўжо былі сустрэты як належныя. Н. Радзюк (філфак), Т. Дронь (гістфак), Т. Васючкова (ФПМ), паспяхова дайшоўшы да фіналу і прайграўшы БПІ, занялі трэцяе месца.

У камандных спаборніцтвах па ўсіх відах зброі першыя месцы заняў ІФК. Спартсменам універсітэта дасталася другое месца. Гэта з'яўляецца вялікім дасягненнем калектыву нашых фехтавальшчыкаў і можа паслужыць добрым пачаткам у аднаўленні багатых традыцый нашай секцыі.

**В. ХРЭНАЎ,**
**ст. выкладчык кафедры фізвыхавання і спорту.**

**На здымках:** (злева) шпажысты БДУ, заняўшыя другое месца (злева направа) Уладзімір Лісоўскі, Сяргей Мяснікоў і Аляксандр Нечапурэнка; (справа) паядынак паміж А. Нечапурэнкам і І. Цітовым (ІФК).





# АДЗІНАЯ МОВА АСК

*У кастрычніку гэтага года ў Маскве адбудзецца агульнасаюзны семінар па тэме «Праблемы інфармацыйнага забеспячэння аўтаматызаваных сістэм кіравання». Аб работах, накіраваных на рашэнне абмяркоўваемай праблемы, расказвае кандыдат тэхнічных навук, намеснік дырэктара УНДІ тэхнічнай інфармацыі, класіфікацыі і кадзіравання Дзяржстандарта СССР Ю. І. БЛАХІН.*

Аўтаматызаваныя сістэмы кіравання (АСК) усё шырэй уваходзяць у паўсядзённае жыццё народнай гаспадаркі краіны. У бягучай пяцігодцы, у адпаведнасці з Дырэктывамі XXIV з'езда КПСС па пяцігадоваму плану, неабходна разгарнуць работы, якія ставяць сваёй мэтай стварэнне агульнадзяржаўнай аўтаматызаванай сістэмы збору і апрацоўкі інфармацыі для ўліку, планавання і кіравання народнай гаспадаркай на базе дзяржаўнай сеткі вылічальных цэнтраў і адзінай аўтаматызаванай сеткі сувязі краіны.

Электронныя памочнікі — хуткадзейнічаючыя вылічальна - рашаючыя канструкцыі, якія выкарыстоўваюцца АСК, дазваляць рэзка ўзняць эфектыўнасць кіравання вытворчасцю, будуць садзейнічаць гарманічнаму развіццю галін народнай гаспадаркі.

Адной з найбольш важных і складаных задач пры стварэнні АСК з'яўляецца класіфікацыя і кадзіраванне. Як вядома, уся інфармацыя, якая закладваецца ў электронна - вылічальную машыну, павінна быць пераведзена на асобую «машынную мову», якая ўяўляе сабой сістэму абазначэнняў, шыфраў і кодаў.

Карыстаючыся такой мовай, можна хутка перадаваць па каналах сувязі любыя звесткі ў выглядзе электрамагнітных сігналаў, уводзіць іх у «памяць» машыны, доўга захоўваць і, па меры неабходнасці, атрымліваць для выкарыстання.

Аднак кадзіраванне—своеасаблівы «пераклад» звычайных паняццяў на «машынную мову» — гэта толькі адзін з этапаў у рабоце па інфармацыйнаму забеспячэнню АСК, прычым этап не самы складаны.

Значна больш працаёмкім у радзе выпадкаў аказваецца працэс класіфікацыі — падрыхтоўка, сістэматызацыя існуючых паняццяў, іх расстаноўка ў строга акрэсленым парадку, адпавядаючаму значнасці кожнага з іх.

Цяжкасцей тут нямала. Перш за ўсё, савецкая народная гаспадарка сёння мае вялікую наменклатуру аб'ектаў. Так, адных толькі таварных відаў прадукцыі ў нашай краіне налічваецца некалькі мільёнаў, і гэта колькасць няспынна расце.

Але і гэта не ўсё. Нярэдка аднолькавыя вырабы выпускаюцца на многіх прадпрыемствах пад рознымі назвамі. Бывае і наадварот — зусім розныя вырабы называюць аднолькава. У ходзе стараннага вывучэння спецыялісты - тэрмінолагі «ўзаконьваюць» найбольш часта ўжываемыя і дакладныя назвы, якія і выкарыстоўваюцца пры класіфікацыі.

Больш сямі год вядзецца ў нашай краіне работа па стварэнню агульнасаюзнага класіфікатара прадукцыі. Каб уявіць яе маштабы, дастаткова сказаць, што ў канчатковым выглядзе класіфікатар будзе перавышаць 150 тамоў.

Кожны від прадукцыі, няхай гэта маленькая шайба ці трактар, духі ці магнітафон, абазначан тут дзесяцізначным лікам. Першыя шэсць лічбаў адлюстроўваюць агульную характарыстыку вырабу, чатыры апошнія служаць свайго роду рэгістрацыйным нумарам канкрэтнага віду прадукцыі.

У бліжэйшы час гэты класіфікатар будзе перададзен для выкарыстання. І любая інфармацыя аб прадукцыі на прадпрыемстве, у межах галіны або агульнадзяржаўным маштабе, будзе выкарыстоўвацца АСК толькі на базе гэтага асноўнага, адзінага для ўсіх дакумента.

Між тым, работы па класіфікацыі і кадзіраванню становяцца ўсё больш інтэнсіўнымі. Выкарыстоўваючы вопыт, накоплены пры стварэнні першага ў краіне класіфікатара прадукцыі, спецыялісты, якія прадстаўляюць вядучыя галіны прамысловасці, пад метадычным кіраўніцтвам УНДІ тэхнічнай інфармацыі, класіфікацыі і кадзіравання, прыступілі да распрацоўкі цэлага комплексу класіфікатараў.

Гэты комплекс, ахопліваючы практычна ўсе без выключэння аб'екты, інфармацыя аб якіх так ці інакш неабходна ў ходзе кіравання народнай гаспадаркай, стане неад'емнай часткай, інфармацыйнай базай сеткі АСК у краіне.

Рэдактар А. А. НІКОЛЕНКА.

Наш адрас: г. Мінск, Універсітэцкі гарадок, геаграфічны корпус, п. 14. Тэлефон — 22-07-19.
Ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга друкарня выдавецтва ЦК КП Беларусі. Заказ 399. АТ 07156